Станоўча ацэньваючы работу, якая была праведзена ў гады дзевятай пяцігодкі партыйнымі камітэтамі і пярвічнымі арганізацыямі калгасаў і саўгасаў рэспублікі па ўкараненню і ўмацаванню гаспадарчага разліку, трэба адзначыць, што ў апошнія гады даследуемага перыяду, таксама як і пазней — у гады дзесятай і адзінаццатай пяцігодак, пераход на больш дасканалыя метады эканамічнага планавання і стымулявання запаволіўся, не стаў нормай для ўсіх гаспадарак, нярэдка ўкараняўся фармальна. Гэта, у сваю чаргу, пагаршала фінансава-эканамічнае становішча гаспадарак, прыводзіла да зніжэння рэнтабельнасці сельскагаспадарчых культур і павелічэння іх сабекошту. Так, напрыклад, калі ў 1970 годзе сабекошт цэнтнера збожжа склаў 8,36 руб., то ў 1975 годзе ўжо 9,4 руб., або павялічыўся на 12,4 % [11]. Прычыны падаражання прадукцыі палёў заключаюцца ў аб'ектыўных і суб'ектыўных фактарах. Да першых трэба аднесці падаражанне некаторых відаў прамысловай прадукцыі, якая пастаўляецца сельскай гаспадарцы, у першую чаргу сельскагаспадарчых машын; павелічэнне расходаў калгасаў і саўгасаў на аплату працы, значны рост цэн на гаруча-змазачныя матэрыялы, мінеральныя ўгнаенні, павышэнне затрат на рамонт тэхнікі. Аднак галоўнай прычынай пагаршэння важнейшых эканамічных паказчыкаў, у першую чаргу павелічэння сабекошту сельскагаспадарчай прадукцыі, з'яўляліся суб'ектыўныя фактары. У іх ліку: нізкі ў цэлым радзе калгасаў, саўгасаў і раёнаў рэспублікі ўзровень арганізацыйнай і палітычнай работы партыйных, савецкіх і сельскагаспадарчых органаў па зніжэнню сабекошту і павелічэнню рэнтабельнасці прадукцыі палёў, значныя недахопы ў выкарыстанні зямлі, тэхнікі, угнаенняў, працоўных рэсурсаў, яшчэ невысокая ў шэрагу гаспадарак Беларусі ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур. Не заўсёды ў цэнтры ўвагі партыйных і савецкіх органаў знаходзіліся пытанні эканамічнай работы, унутрыгаспадарчага разліку, укараненне прагрэсіўных форм арганізацыі і аплаты працы. Прычынай маруднага ўкаранення гаспадарчага разліку, як сведчыць практыка, з'яўлялася тое, што многія кіраўнікі калгасаў і саўгасаў баяліся новых форм гаспадарання.

Такім чынам, вопыт партыйнага кіраўніцтва ўкараненнем і ўмацаваннем гаспадарчага разліку ў земляробства рэспублікі ў гады дзевятай пяцігодкі пераканаўча паказаў, што там, дзе гэтаму пытанню ўдзялялася пільная ўвага, няўхільна расла эфектыўнасць земляробства, ішло паскарэнне тэмпаў роста сельскагаспадарчай вытворчасці.

[1] Матэрыялы XXVII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Мінск, 1986. С. 37.
[2] Гл.: Ленін У. І. Творы. Т. 33. С. 160.
[3] Матэрыялы XXIV з'езда КПСС. Мінск, 1987. С. 138—139.
[4] Матэрыялы XXVII з'езда Камуністычнай партыі Беларусі. Мінск, 1971. С. 69.
[5] ПА Брэсцкага АК КПБ. Ф. 1, воп. 43, спр. 66, л. 20.
[6] ПА Мінскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 67, спр. 26, л. 35.
[7] ПА Гродзенскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 72, спр. 27, л. 8.
[8] ПА Гомельскага АК КПБ. Ф. 144, воп. 137, спр. 8, л. 60.
[9] Там жа. Л. 29
[10] ПА Гомельскага АК КПБ. Ф. 144, воп. 144, спр. 35, л. 144.
[11] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 46, спр. 893, л. 9.

І. І. ГВАРДЗЕЕЎ

## ДЗЕЙНАСЦЬ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ БЕЛАРУСІ ПА ПРЫЁМУ Ў ПАРТЫЮ РАБОЧЫХ І ВЫХАВАННЮ МАЛАДЫХ КАМУНІСТАЎ (1976—1985)

КПСС заўсёды першаступеннае значэнне надавала пытанням свайго сацыяльнага саставу. У. І. Ленін якасць радоў партыі камуністаў звязваў з развіццём рабочага класа як сацыяльнай базы, сілкуючай партыю.

У разглядаемы перыяд, выконваючы рашэнні XXV з'езда КПСС, якія канкрэтызаваліся ў пастанове Цэнтральнага Камітэта ад 28 верасня 1976 года «Аб рабоце партыйных арганізацый Кіргізіі па прыёму ў партыю і выхаванню кандыдатаў у члены КПСС»[1], партыйныя арганізацыі ў пытаннях папаўнення сваіх радоў арыентаваліся на найбольш свядомых, палітычна сталых рабочых і дабіваліся забеспячэння іх авангарднай ролі ў вытворчасці і грамадска-палітычным жыцці.

Рабочы клас аказвае вызначальнае ўздзеянне на развіццё палітычнай сістэмы савецкага грамадства, на ўвесь працэс далейшага ўдасканалення і паглыблення сацыялістычнай дэмакратыі. Рабочыя разам з сялянствам і інтэлігенцыяй актыўна ўдзельнічаюць у кіраванні справамі грамадства і дзяржавы.

Асабісты прыклад камуністаў-рабочых у працы, іх арганізатарская работа маюць выключна важнае значэнне ў кіруючай дзейнасці КПСС, у мабілізацыі працоўных мас на ажыццяўленне задач камуністычнага будаўніцтва. Рабочы клас выступае галоўным носьбітам ідэалогіі марксізму-ленінізму і пралетарскага інтэрнацыяналізму, слаўных рэвалюцыйных і працоўных традыцый.

І нарэшце, яшчэ адна важная абставіна, якую КПСС улічвае, забяспечваючы вядучае становішча рабочых у сваіх радах. Рабочы клас — гэта найбольш арганізаваны і дысцыплінаваны клас. І на новым этапе гістарычнага развіцця нашай краіны, гэта значыць на этапе планамернага і ўсебаковага ўдасканалення сацыялістычнага грамадства, калі партыя стала авангардам савецкага народа, яна не страчвае свайго класавага характару. У новай рэдакцыі Праграмы КПСС, прынятай XXVII з'ездам партыі, адзначалася, што па сваёй класавай сутнасці і ідэалогіі КПСС застаецца партыяй рабочага класа [2]

У дакументах XXV—XXVII з'ездаў КПСС і іншых партыйных рашэннях апошніх гадоў вызначаны шляхі рэгулюючага ўздзеяння партыйных арганізацый на паляпшэнне сацыяльнага саставу сваіх радоў, правільных суадносін партыі, рабочага класа і масы.

Партыйныя арганізацыі Беларусі ў перыяд паміж XXV і XXVII з'ездамі КПСС, ажыццяўляючы рэгуляванне росту партыйных радоў, узмацнялі адбор у партыю лепшых прадстаўнікоў рабочага класа, праводзілі сістэматычную работу па выхаванню ўсіх камуністаў як свядомых, ідэйна загартаваных байцоў партыі, актыўных будаўнікоў камунізму.

Вось як, напрыклад, выглядала дынаміка росту партыйных радоў за кошт рабочых па некаторых партарганізацыях. У Мінскай абласной партарганізацыі рабочыя ў ліку прынятых ў 1976—1981 гадах складалі каля 45 %. У 1980 годзе іх сярод прынятых кандыдатаў у члены партыі было амаль 61 % (самы высокі паказчык за апошнія 20 гадоў); у Магілёўскай абласной арганізацыі ў штогадовым партыйным папаўненні рабочыя складалі ў гэты перыяд больш 57 %, у 1984 годзе рабочыя складалі каля 45 % саставу абласной партарганізацыі. На VI Пленуме Гродзенскага абкома КПБ у чэрвені 1980 года адзначалася, што ў саставе абласной партыйнай арганізацыі няўхільна ўзрастае ўдзельная вага рабочага класа: у 1979 годзе сярод прынятых кандыдатаў партыі было 53 % рабочых, што таксама з'яўлялася самым высокім паказчыкам за апошнія гады [3].

У такім жа напрамку вялі работу і пярвічныя партыйныя арганізацыі. Так, у партыйнай арганізацыі Мінскага трактарнага завода імя У. І. Леніна ў 1976 годзе было прынята ў партыю 170 чалавек, з іх 136 рабочых, што складала 80 %. У 1982 годзе кандыдатамі ў члены КПСС на заводзе было прынята 170 чалавек, членамі партыі сталі 167 чалавек, з іх 130 — рабочыя [4]. Прычым партыйная арганізацыя завода не проста павялічвала колькасць рабочых у сваім саставе, а арыентавалася на прыём перш за ўсё тых, хто актыўна праяўляў сябе ў працы і грамадскім жыцці, карыстаўся аўтарытэтам і павагай у калектыве. Тут умела выкарыстоўваліся магчымасці цэхавых арганізацый і партгруп па адбору ў партыю найбольш дастойных работнікаў. Яны глыбока вывучалі дзелавыя, палітычныя і маральныя якасці ўступаючых, улічвалі меркаванні камуністаў, беспартыйных. Прыём у партыю праводзіўся, як правіла, на адкрытых партыйных сходах, дзе адбывалася грунтоўнае абмеркаванне вартасцей і недахопаў уступаючых. Асаблівую ўвагу цэхавыя партарганізацыі завода ўдзялялі таму, каб у партыю прымаліся людзі, якія маюць вялікі стаж работы на вытворчасці, гэта значыць тыя, хто на працягу шэрагу гадоў добра зарэкамендаваў сябе на вытворчасці і ў кім не сумняваюцца таварышы па працы. Напрыклад, у 1979 годзе партыйная арганізацыя кавальска-тэрмічнага цэха прыняла ў партыю члена цэхкома, настаўніка моладзі В. С. Белага, які 16 гадоў працаваў наладчыкам гэтага цэха. 8 гадоў працаваў заліўшчыкам у ліцейным цэху А. Б. Кур'яновіч, які з'яўляўся рэдактарам насценнай газеты, дружыннікам.

Пасля XXV з'езда КПСС павялічыўся прыём у партыю рабочых вядучых прафесій. Так, у 1980 годзе ў ліку прынятых яны складалі больш 80 % у пярвічных партарганізацыях вытворчага аб'яднання «Хімвалакно»

імя У. І. Леніна, аўтазавода імя С. М. Кірава [5]. Павялічваючы сваё рабочае ядро за кошт такіх людзей, партыйныя арганізацыі яшчэ больш цэментавалі згуртаванасць працоўных калектываў.

Такім чынам, у 1976—1985 гадах вызначальным напрамкам у дзейнасці партарганізацый Беларусі па рэгуляванню росту партыйных радоў з'яўлялася забеспячэнне пераважнага прыёму ў партыю прадстаўнікоў рабочага класа. Гэта садзейнічала росту рабочага ядра ў Камуністычнай партыі Беларусі. Так, калі ў 1976 годзе яно складала 41,2 %, то ў 1985 годзе—45,4 % [6].

Адначасова з адборам і прыёмам перадавых рабочых партыйныя арганізацыі рэспублікі займаліся выхаваннем маладых камуністаў. Важная роля тут надавалася эфектыўнаму выкарыстанню кандыдацкага стажу для ўсебаковага азнаямлення ўступаючых з Праграмай і Статутам КПСС і для грунтоўнага засваення норм партыйнага жыцця.

Партыйныя арганізацыі рэспублікі набылі багаты вопыт работы з кандыдатамі ў члены КПСС, ствараючы ўмовы для таго, каб маладыя партыйцы станоўча праявілі сябе ў працоўнай і грамадскай дзейнасці калектываў, паказвалі прыклад камуністычных адносін да працы, прынцыпова адносіліся да недахопаў і ўпушчэнняў. Так, партыйная арганізацыя Магілёўскага завода «Строммашына» ўдзяляла вялікую ўвагу павышэнню творчай і грамадскай актыўнасці кандыдатаў у члены КПСС. Маладыя камуністы гэтай арганізацыі разметчык В. Ю. Тарасаў, токар А. Д. Акуленка, газарэзчык Н. Н. Жукаў, паказваючы прыклад ударнай працы, выканалі заданні дзесятай пяцігодкі да 110-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна. Токары Г. А. Савічаў і І. З. Царыкаў неаднаразова былі пераможцамі заводскага сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар XXVI з'езда КПСС [7].

Большасць маладых камуністаў не толькі добрасумленна адносіліся да сваіх абавязкаў, але і актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці. Сярод іх былі дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, круцільшчыца Гродзенскага вытворчага прадзільна-нітачнага аб'яднання імя XXV з'езда КПСС Т. І. Герман, дэпутат абласнога Савета народных дэпутатаў, слесар Гродзенскага завода гандлёвага машынабудавання В. Э. Андрушкэвіч, дэпутат раённага Савета народных дэпутатаў, раскройшчыца Гродзенскай швейнай фабрыкі С. Т. Бушук [8].

У рабоце партыйных арганізацый па выхаванню маладых камуністаў атрымалі распаўсюджанне асабістыя планы на перыяд праходжання кандыдацкага стажу, шырока выкарыстоўваліся гутаркі з членамі і кандыдатамі ў члены КПСС, заслухоўваліся іх справаздачы на сходах і пасяджэннях бюро аб праходжанні кандыдацкага стажу, аб выкананні патрабаванняў Праграмы, Статута КПСС, службовых абавязкаў і грамадскіх даручэнняў.

Партыйныя арганізацыі Беларусі пастаянна праяўлялі клопат аб паляпшэнні работы школ маладых камуністаў, якія працавалі пры гаркомах, райкомах і ў пярвічных партыйных арганізацыях. Асаблівая ўвага ў школах удзялялася марксісцка-ленінскай адукацыі камуністаў і павышэнню іх авангарднай ролі ў вытворчым і грамадска-палітычным жыцці працоўных калектываў.

Такі падыход да выхавання маладых камуністаў замацаваны ў рашэннях XXVII з'езда КПСС і XXX з'езда КПБ. Ён з'яўляецца адной з крыніц павышэння баяздольнасці партыі, росту актыўнасці партыйных мас.

У пастанове ЦК КПСС ад 17 чэрвеня 1987 года «Аб сур'ёзных недахопах у рабоце Ташкенцкай абласной партарганізацыі па прыёму ў партыю і ўмацаванню партыйных радоў» [9] падкрэслена, што кандыдацкі стаж заклікан забяспечыць карэннае паляпшэнне якасці партыйнага папаўнення, прадметам асаблівага клопату партыйных арганізацый павінна быць ідэйна-маральнае выхаванне камуністаў, перш за ўсё маладога папаўнення. На першы план у гэтай рабоце вылучаецца фарміраванне ў членаў і кандыдатаў у члены КПСС камуністычнай перакананасці, актыўнай пазіцыі ў рэалізацыі лініі партыі, высокіх маральных якасцей, пачуцця сацыялістычнага інтэрнацыяналізму і савецкага патрыятызму.

[1] КПСС у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК. М., 1987. Т. 13. С. 132.

[2] Матэрыялы XXVII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Мінск, 1986. С. 225.

[3] ПА Мінскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 76, с. 11, л. 93; ПА Магілёўскага АК КПБ. Ф. 9, воп. 165, с. 18, л. 142; ПА Гродзенскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 84, с. 9, л. 96.
[4] ПА Мінскага АК КПБ. Ф. 23, воп. 48, с. 3, л. 173—174.
[5] ПА Магілёўскага АК КПБ. Ф. 42, воп. 44, с. 1, л. 119.
[6] Камуністычная партыя Беларусі. Мінск, 1986. С. 17.
[7] ПА Магілёўскага АК КПБ. Ф. 6009, воп. 18, с. 15, л. 158.
[8] ПА Гродзенскага АК КПБ. Ф. 6176, воп. 4, с. 2, л. 69.
[9] Гл.: Правда. 1987. 18 июня.

В. Г. ШАДУРСКІ

## З ВОПЫТУ РАБОТЫ КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ ПА ЎДАСКАНАЛЕННЮ АРГАНІЗАЦЫІ ВОЛЬНАГА ЧАСУ МАЛАДЫХ РАБОЧЫХ (1976—1985)

Важнае месца ў дзейнасці КПСС і савецкай дзяржавы па фарміраванню гарманічна развітой асобы займаюць пытанні арганізацыі вольнага часу працоўнай моладзі. У новай рэдакцыі Праграмы КПСС падкрэсліваецца, што «партыя лічыць неабходным значна ўзмацніць увагу да сацыяльных праблем моладзі і перш за ўсё да развіцця і больш поўнага задавальнення грамадска значных інтарэсаў і патрэбнасцей юнакоў і дзяўчат у сферы працы і быту, адукацыі і культуры, прафесійнага і службовага росту, разумнага выкарыстання вольнага часу»[1].

Цікавы вопыт па рацыянальнаму выкарыстанню вольнага часу маладых рабочых назапашаны партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі Беларусі ў 1976—1985 гады. Дзейнасць партыйных, камсамольскіх арганізацый рэспублікі ў гэтым напрамку трэба ўважліва вывучаць, каб глыбей прааналізаваць дапушчаныя ў мінулым пралікі і памылкі, каб па крупінках сабраць і абагульніць увесь накоплены вопыт, максімальна выкарыстоўваючы яго ў сваёй паўсядзённай дзейнасці.

Вольны час рэалізуецца перш за ўсё па месцу пражывання працоўных. Зыходзячы з гэтага, партыйныя, камсамольскія арганізацыі ў разглядаемы перыяд пастаянна працавалі над стварэннем такой сістэмы арганізацыі работы, якая дазволіла забяспечыць бесперапыннасць ідэйнавыхаваўчага працэсу «працоўны калектыў — месца пражывання». Так, у жніўні 1978 года бюро Мінскага ГК КПБ зацвердзіла «Комплексны перспектыўны план камуністычнага выхавання працоўных у сферы вольнага часу на 1978—1985 гады». Была створана трохзвенная структура выхаваўчай работы па месцу пражывання: горад, раён, мікрараён. На ўсіх гэтых узроўнях дзейнічалі адпаведна органы кіраўніцтва: на першых двух — гарадскі і раённыя каардынацыйныя саветы на чале з першымі сакратарамі гаркома і райкомаў партыі, на трэцім — ідэалагічныя камісіі, якія ўзначалілі прадстаўнікі арганізацыі, замацаванай за мікрараёнам [2].

У Пінскім ГК КПБ на аснове вывучэння сацыяльна-дэмаграфічных характарыстык насельніцтва былі састаўлены сацыяльныя пашпарты мікрараёнаў. Яны сталі зыходным матэрыялам у планаванні ўсёй работы па арганізацыі адпачынку пінчан. Вялікім поспехам у жыхароў горада карысталіся фестываль мастацтваў «Зоры над Пінай», марш-парады духавых аркестраў, святы мікрараёнаў «Табе, Радзіма, наша праца, нашы песні»[3].

Гэты вопыт быў абагульнены на рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (чэрвень 1978). Вынікі і рэкамендацыі канферэнцыі знайшлі адлюстраванне ў пастанове ЦК КПБ «Аб стане і мерах па далейшаму ўдасканаленню ідэйна-выхаваўчай работы па месцу пражывання працоўных у святле патрабаванняў XXV з'езда КПСС»[4]. ЦК Кампартыі Беларусі прызнаў неабходным, выкарыстоўваючы вопыт дзейнасці ідэалагічных камісій і грамадскіх саветаў мікрараёнаў, да 1 студзеня 1979 года паўсюдна ўпарадкаваць арганізацыйную структуру масава-палітычнай работы па-за вытворчасцю: замацаваць партыйныя арганізацыі прадпрыемстваў і ўстаноў за мікрараёнамі ў межах выбарчых акруг, скласці пашпарты мікрараёнаў.

Прынятыя меры паклалі пачатак стварэнню адзінай сістэмы планавання і кіравання ідэйна-выхаваўчым працэсам па месцы пражывання, што дазволіла каардынаваць і аб'ядноўваць намаганні розных устаноў і арганізацый. Створаная сістэма прайшла праверку часам і даказала сваю жыццяздольнасць. І калі раней уся адказнасць за ажыццяўленне выхаваўчага працэсу па-за вытворчасцю ўскладалася толькі на партарганізацыі